Olimpiada Języka Białoruskiego – XXVIII edycja
Zawody II stopnia (okręgowe)
**13 stycznia 2022 roku**

## I. Дзеясловы ў дужках запішы ў форме загаднага ладу. (10 пунктаў)

Ты (1) ....................(**прыйсці**), вясна жаданая,
(1) .....................(**прыйсці**),
Гукам жыцця, песняй працы
(2).....................(**загудзець**).

Ты (2) (**несці**) нам радасць, сілачку
(3).......................(**несці**),
Нашу ленасць і нядбаласць
(4)....................... (**атрэсці**).

Наша жыцце, нашу долечку
(5) .....................(**пабачыць**),
Над жытамі цёплым дожджыкам
(6) .....................(**заплакаць**).

(7) .......................(**пракаціцца**) громам-грукам
Угары.
Ты (8) .................(**ісці**), (3) ................ (**несці**) цудоўныя
Дары.

(9) ...................... (**узбагаціць**) ты добрым засевам
Наш край.
Ты (1) .................. (**прыйсці**) і з намі дружна
(10) ....................... (**заспяваць**).

Я. Колас, *Заклiканне вясны*

## II.Замяні словазлучэнне ў дужках адным словам. (5 пунктаў)

1. ............ (*на пачатку вясны*), калі ў лесе яшчэ ляжаў тоўсты пласт снегу, а рэчка была пад лёдам, кідалі алешыны свае цёмныя зернеткі на лёд, каб вясною вада разам з лёдам панесла іх і пасеяла на сваіх берагах на краі лесу, дзе было многа прастору.

2. Яшчэ .......... (*год таму*) стаяў ён над самым Нёманам; размыла вада бераг; абваліўся ён разам з дубам у Нёман, і панесла старога вада.

3. Няхай міне нас гора ўсяка;
Дай, Божа, добрую прыгоду,

Каб больш ............ (*у наступным годзе*) было мёду;

Каб мы пілі, яшчэ прасілі,

Каб на галовах захадзілі,

4. Яму ............ (*у гэтым годзе*), здаецца, пяцьдзесят стукнула.

5. Тэкля Казіміраўна была такая ж рухавая, як і .........(*два гады таму*), і гаворка яе лілася гэтак жа гладка і безупынна, як і тады.

**Словы для ўстаўкі:** сёлета, пазалетась, напрадвесні, налета, летась.

### III. Дапоўні сказы прыслоўямі, утварыўшы іх ад прыметнікаў у дужках. (5 пунктаў)

1. На гэты вадаспад, што так (1) ……………………. (**гучны**) сакатаў на ўсю ваколіцу, было шмат нараканняў.

2. Старасвецкі лес, асабліва тыя сыны яго, што стаялі непадалёку ад вадаспада, даўно ўжо (2) …………….. (**сярдзіты**) шумелі, сварыліся і гразілі вадаспаду.

3. – Я – частачка таго самага вадаспада, на які ты так крыўдуеш, – сказала расінка і яшчэ больш загарэлася: ёй (3) …………. (**прыкры**) было слухаць скаргу пліскі-даўгахвосткі, бо і сама яна, роска, была крыху вінавата ў гэтым яе горы.

4. Чарнабыльнік, пачуўшы гэта, (4) ………… (**ціхі**) засмяяўся і загайдаўся ад смеху.

5. Беднай росачцы зусім (5) ………. (**саромны**) стала, і яна, адбіўшы ў сабе апошні раз прамень сонца, упала на дол і знікла

### IV. Утвары ласкальна-памяншальную форму назоўнікаў, выкарыстай назоўнікі ў патрэбным склоне і ліку. (10 пунктаў)

Тут Вецер надзьмуў свае шчокі, набраў духу, прысеў і падскочыў і разам узляцеў на высокую Гару. І адразу стала святлей на душы маленькага хлопчыка, бо тут было так прыгожа, так светла, ціха і цёпла. Зніклі гэтыя снежныя раўніны, пустэлі, гэты холад і згрызоты зямлі і яе пакута. Гара была высыпана жоўценькім (1)............ (**пясок**). То тут то там зелянелі на ёй тысячы (2) .............. (**востраў**) з разнастайнай раслінай. У зялёных галінках шчабяталі птушачкі незвычайнага хараства. Срэбныя (3) **.........** (**ручай**) бліскучымі стужкамі ззялі на сонцы, весела гаманілі ў сваіх (4) .......... (**бераг**), скачучы па чыстых, гладзенькіх (5) ........... (**камень**). Іх цурчанне складала такую чароўную музыку, як бы тут звінелі тысячы залатых струн. Над саменькаю вадою снаваліся, як белыя сняжынкі, матылькі і рознакаляровыя стракозы-бабкі, то ўзлятаючы ўгору, то апускаючыся ўніз, чуць дакранаючыся вады.

Якуб Колас, *Пад Новы год.*

### V. Пустыя месцы ў тэксце запоўні словамі для ўстаўкі. Звярні ўвагу, што слоў для ўстаўкі на два больш. (10 пунктаў)

**словы для ўстаўкі:** ахінулі, бяздонных, жыцця, жэўжыка, задумаліся, малазначным, недасяжных, незлічонымі, нікчэмнымі разляцеліся, смерці, чароўным.

Шырокі малюнак (1).............. светаў раскрываўся перад вачамі маладога настаўніка ва ўсёй сваёй таемнасці і бязмежнасці. І чым больш мысль захоплівалася гэтым (2).......... малюнкам і гэтымі (3)......... светамі, раскіданымі сярод (4)........... багнаў, такіх страшных, такіх

павабных, – зямля і чалавек, пагардлівы гаспадар яе, рабіліся ўсё меней і меней значнымі, (5)............ Гэта бязмежнасць зацірала зямлю, і яна гублялася ў ёй, як малюсенечкая пылінка. А якім (6)..............., непрыметным з'яўляўся чалавек, яго клопат, яго штодзённыя драбніцы (7)............! Новыя думкі і настроі (8)............... маладога настаўніка. Але гэтыя думкі ў момант (9)............., як вераб'і, калі ў іх вясёлы гурток паляціць каменьчык, кінуты рукою якога-небудзь падшывальца-(10)..............; страшны і непрыемны вобраз смерці бліснуў сярод гэтых думак маладога настаўніка і разагнаў іх. На адзін момант жыццё ў ім як бы спынілася. Па яго целе прабегла дрыготка, бо гэты вобраз смерці вынік зусім неспадзявана.

Якуб Колас. *У палескай глушы*

### VI. Перакладзі на польскую мову. (25 пунктаў)

Вёска Лосеўка стаяла між лесу і балот. Лес цягнуўся ўкруг вёскі цесным колам. Сама вёска дзялілася на дзве часці. Меншая часць вёскі, Сяльцо, стаяла ад самой вёскі чуць не на вярсту. Дарога, каторая шла з вёскі ў Сяльцо, прахадзіла паміж могілак і карчмы. Старая аграмадная карчма, каторых так часта можна ўбачыць яшчэ і цяпер на Палессі, стаяла на сярэдзіне дарогі з вёскі ў Сяльцо. Напроці карчмы, крокаў за сто, стаялі могілкі, цёмныя, старыя, з хваёвымі крыжамі, каторыя, як частакол, густа тырчалі адзін каля аднаго. Могілкі з іх старою драўлянаю капліцаю, з двума ці трыма зялёнымі клёнамі і некалькімі хвоямі, таўстымі, развесістымі; карчма з гнілою абросшаю мохам стрэхаю рабілі ўсё мейсца страшным і дзікім.

З Сяльца ў вёску раз уночы ішла баба. Як толькі падышла яна пад карчму, то пачула, што на могілках нешта плакала, як дзіця. Гэта сава ці пугач свістаў у гнілой капліцы. Узяла баба падол у зубы ды такога задала лататы, што яе і з сабакамі не злавіў бы. Прыбегшы да вёскі, яна расказала пра невядомы плач. З гэтага часу простыя цёмныя людзі і ўпраўду сталі што-небудзь чуць або бачыць, як здарывалася каму ісці аднаму ўночы між карчмы і могілак, хоць там і нічога не было.

Страхі найчасцей здараюцца ўночы. Уночы чалавек кепска бачыць і часта самую пустую рэч прымае за страх. Апроч таго, нас яшчэ маленькіх страшаць цемнатою, усякімі дзедамі з торбамі, каторыя, быццам, бяруць нягодных плаксівых дзяцей. Памаленьку, незаметна для нас саміх, у нашу душу засяваецца зерне страху, ад каторага чалавеку потым трудна аслабаніцца. Непанятнае і страшнае для нас усё тое, чаго прычыны мы не знаем. Болей навукі – меней страху.

паводле: Якуб Колас, *Як выдумляюцца страхі.*

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................